www.sakavik.net

# Развіццё мовы беларусаў

| Перыяд развіцця краіны | Стан развіцця мовы |
|---|---|
|  **960 – 1397** **Полацкае княства** | **Мяркуюць, што развіццё старабеларускай мовы з царкоўнаславянскай мовы пачалося ў 10-11 ст. разам з этнанацыянальным размежаваннем усходніх славян. У 14 ст. адрозніваюць гаворкі і мовы ўсходніх славян.** |
|  **1236 – 1569** **Вялікае Княства Літоўскае** | **У 14 ст. пры князі Альгердзе старабеларуская мова стала ўжывацца як дзяржаўная мова ВКЛ. Першая кніга на старабеларускай мове была надрукавана Ф. Скарынам у 1517 годзе ў Празе.** |
|  **1569 – 1795** **Рэч Паспалітая** | **Статут ВКЛ 1588 года напісаны на старабеларускай мове. Пасля аб'яднання ВКЛ з Каралеўствам польскім (1569) адзначаецца значны уплыў польскай мовы, якую прымалі многія магнаты і багатая шляхта. У 1696 г. старабеларускую мову, якая была дзяржаўнай у ВКЛ, замяніла польская мова. На старабеларускай, тутэйшай мове, размаўлялі ў асноўным сяляне.** |
|  **1795 – 1917** **без дзяржаўнасці** *(у складзе Расійскай імперыі)* | **У 1839 г. імператар Мікалай I забараніў ужываць "народную гаворку" ў каталіцкіх храмах; як вынік, тую цалкам замяніла польская. У 1859 г. расійскія ўлады забаранілі друк па-беларуску лацінскім алфавітам. Беларуская літаратурная мова нарадзілася у канцы 19 ст.** |
|   **1917 – 1990** **БНР, БССР** | **Найбольш спрыяльным для развіцця беларускай мовы быў перыяд беларусізацыі ў 20-30-х гадах 20-га стагоддзя. У далейшым пачалася русіфікацыя: так, доля кніг на беларускай мове ў БССР зменшылася за перыяд з 1950 па 1985 г.г. з 85% да 9%.** |
|   **з 1990** **сучасны этап** | **Вельмі спрыяльным для беларускай мовы быў перыяд непасрэдна пасля абвяшчэння незалежнасці (1990-1995). Прынясце ў якасці дзяржаўных дзвюх моў, беларускай і рускай (рэферэндум 1995), у значнай ступені затармазіла далейшае развіццё і ўжыванне беларускай мовы насельніцтвам Беларусі.** |